**РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**
**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

# АБ АБАРОНЕ СУВЕРЭНІТЭТУ І НЕДАПУШЧЭННІ ЎЦЯГВАННЯ БЕЛАРУСІ Ў ВАЙНУ

8–9 жніўня, Варшава

Канстатуючы, што нелегітымны рэжым Лукашэнкі паслядоўна саўдзельнічае ў расійскай агрэсіі супраць Украіны праз прадастаўленне тэрыторыі, паветранай прасторы, інфраструктуры і іншых рэсурсаў для падрыхтоўкі і ажыццяўлення поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну ў 2022 годзе, і далейшага падтрымання расійскай агрэсіі;

Адзначаючы сістэмную мілітарызацыю Беларусі, ад выкарыстання беларускіх прадпрыемстваў у інтарэсах расійскага ваенна-прамысловага комплексу да мілітарызацыі грамадства, у тым ліку сярод дзяцей і моладзі праз сістэму адукацыі і вайскова-патрыятычных захадаў;

Заўважаючы няздольнасць кіруючага рэжыму на самастойную палітыку ў сферы бяспекі, праз сістэмны дэфіцыт унутранай і міжнароднай легітымнасці, а таксама палітычнай волі на паўнавартасную незалежнасць ад Расіі;

Прымаючы да ўвагі паведамленні Украіны пра сістэмнае выкарыстанне тэрыторыі і эканамічных рэсурсаў Беларусі для падтрымкі расійскай агрэсіі, у тым ліку размяшчэнне рэтранслятараў для накіравання дронаў, прадастаўленне беларускай паветранай прасторы, продаж паліва і прадукцыі беларускага вайскова-прамысловага комплексу ўзброеным сілам РФ, а таксама іншыя правакацыі, якія рыхтуюцца з удзелам Беларусі;

Беручы пад увагу заявы Генеральнага сакратара НАТА і вайсковых выведак краінаў НАТА, што Расія зможа напасць на ўсходні фланг НАТА ў 2027–2030 гадах;

Зыходзячы з таго, што любыя сутыкненні паміж Расіяй і НАТА ў краінах Балтыі і Польшчы, і перш за ўсё вакол Сувалкскага калідора, будуць непасрэдна ўключаць тэрыторыю Беларусі,

**Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы Дэмакратычных сіл Беларусі**,

Патрабуем спынення ўсялякай падтрымкі расійскай агрэсіі: выкарыстанне тэрыторыі, паветранай прасторы, інфраструктуры і ўзброеных сіл Беларусі для агрэсіі супраць іншых дзяржаў недапушчальна;

Заклікаем міжнародную супольнасць дамагацца спынення такой падтрымкі ўсімі магчымымі палітычнымі, дыпламатычнымі і эканамічнымі інструментамі;

Сур'ёзна ацэньваем пагрозы далейшага ўцягвання Беларусі ў вайну, у тым ліку пагрозы выкарыстання Расіяй беларускай тэрыторыі і войска, для новых ваенных дзеянняў альбо іншых правакацый супраць Украіны і краінаў НАТА;

Катэгарычна асуджаем любыя дзеянні ці бяздзеянне кіруючага рэжыму, якія спрыяюць рэалізацыі гэтых пагрозаў. Такія злачынныя дзеянні альбо бяздзеянні супярэчаць нацыянальным інтарэсам Беларусі і не адлюстроўваюць волю беларускага народа;

Памятаем, што ў гісторыі на тэрыторыі Беларусі ўжо не раз адбываліся вайсковыя дзеянні, якія не былі ініцыяваныя Беларуссю ці з удзелам легітымных прадстаўнікоў народу Беларусі. Такія вайсковыя дзеянні кожны раз мелі катастрафічныя наступствы – масавыя чалавечыя ахвяры, разбурэнне эканомікі, прыроды, гісторыка-культурнай спадчыны – і агулам ставілі пад пагрозу далейшае існаванне беларускай нацыі;

Заяўляем, што недапушчэнне паўтарэння такіх сцэнароў мае быць прыярытэтнай задачай для любога беларускага палітыка, дзяржаўнага службоўцы ці вайскоўцы;

Абавязуемся самі – і заклікаем усіх грамадзян Беларусі, безадносна да палітычных поглядаў, – рабіць усё магчымае для захавання міру ў Беларусі, і на любым узроўні актыўна супрацьстаяць уцягванню нашай краіны ў вайну.

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб'яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*